Пішучы пра вайну, І. Пташнікаў часта разважае пра чалавека ў экстрэмальных умовах. А дзеці ў яго прозе нярэдка паўстаюць не проста ахвярамі фашызму, але і актыўнымі і адважнымі змагарамі супраць яго. Яны гэтак жа, а часам нават з большай апантанасцю, чым дарослыя, ненавідзяць ворагаў. Галоўнай ідэяй такіх твораў І. Пташнікава становіцца ідэя маральнай непераможнасці народа акупаванай фашыстамі краіны, ідэя яго духоўнага подзвігу.

Ва ўсіх трох пералічаных вышэй апавяданнях галоўным героем з'яўляецца падлетак, які жыве ў паэтычнай гармоніі з навакольным светам, адкрыта і даверліва ўспрымае яго праявы. Свет гэты пакуль што невялікі, абмежаваны блізкімі людзьмі, абумоўлены непасрэднымі ўражаннямі і адчуваннямі. У вобразах Алёшы (апавяданне “Алёшка”) і Ірынкі (твор “Алені”) пісьменнікам створаны сапраўды запамінальныя, псіхалагічна выверанця і пераканаўчыя мастацкія характары. Маленькі Алёшка, які засяроджаны на думках аб блізкіх, клапоціцца аб галоднай і хворай маці, успамінае бацьку, якому на фронце так хацелася б хутчэй атрымаць ліст з дому. Дванаццацігадовая дачка лесніка Ірынка жыве прагай любові, імкненнем да абароны прыгожых і бездапаможных істот – аленяў, якім яна носіць пачастункі. У душы героя апавядання “Бежанка” тоіцца першае, яшчэ сарамлівае, пачуццё кахання.

Нягледзячы на “мірны канфлікт”, у малой прозе І. Пташнікава нязменна прысутнічае подых вайны, наступствы ці актуаліі якой абумоўліваюць развіццё сюжэта ў кожным творы: гэта і пасляваенны голад у “Аленях”, і матыў бежанства ў “Бежанцы”, і рэаліі ліхалецця, паказаныя вачыма дзіцяці ў апавяданні “Алёшка”. У пералічаных вышэй творах І. Пташнікаву ўдалося перадаць арганічнае адзінства прозы рэальных фактаў і паэзіі дзіцячага іх успрымання, і гэты кантраст дазваляе пісьменніку яшчэ з большай сілай паказаць бесчалавечную сутнасць вайны.

Такім чынам, у апавяданнях “Алені”, “Алёшка”, “Бежанка” І. Пташнікава пры адлюстраванні тэмы вайны адчуваецца відавочнае ўзмацненне гуманістычнага пафасу. Духоўнасць герояў, чысціня і прыгажосць успрыняцця імі жыцця, якія захоўваюцца, нягледзячы на ўсе складанасці гэтага часу, супрацьпастаўлены жорсткасці і цынізму ваенных рэалій, што дазваляе пісьменніку паглыбіць ідэйны змест апавяданняў. У малой прозе І. Пташнікаву ўдалося стварыць сапраўды запамінальныя, глыбокія і псіхалагічна пераканаўчыя характары дзяцей і падлеткаў, вачыма якіх і падаюцца падзеі ваеннай і пасляваеннай рэчаіснасці.

**Літаратура**

1 Багарадава, Т. Р. Чалавек як выразнік асноўных ідэй і прынцыпаў “ваеннай” аповесці І. Пташнікава / Т. Р. Багарадава // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А, Гуманитарные науки. Литературоведение. – 2011. – № 10. – С. 28–33.

***В. А. Сцепчанка***
*Навук. кір.* ***З. У. Шведава****,*
*канд. філал. навук, дацэнт*

## ПРЫЁМЫ ВІЗУАЛІЗАЦЫІ НА ЭТАПЕ ЗАМАЦАВАННЯ ЎРОКА МОВЫ

Выкарыстанне нагляднасці характэрна для ўсіх этапаў школьнага навучання, і сфера яе прымянення пастаянна пашыраецца. Прымяненне наглядных сродкаў з'яўляецца асабліва актуальным на этапе замацавання інфармацыі. Візуальныя сродкі спрыяюць павышэнню ўзроўню засваення матэрыялу і развіццю крытычнага і крэатыўнага мыслення вучняў.

Варта адзначыць, што наглядныя сродкі на этапе замацавання інфармацыі могуць служыць моцным інструментам для засваення і запамінання матэрыялу. Іх выкарыстанне спрыяе не толькі ўспрыманню новай інфармацыі, але і яе інтэграцыі ў існуючыя веды вучняў. Візуальныя элементы, такія як схемы, графікі, малюнкі і дыяграмы, могуць значна палепшыць разуменне і запамінанне звестак, бо яны актывізуюць розныя кагнітыўныя працэсы.

Пры выкарыстанні наглядных сродкаў вучні атрымліваюць магчымасць бачыць сувязі паміж рознымі паняццямі, што дапамагае ім лепш усведамляць структуру і логіку вывучаемага матэрыялу. Прыкладам могуць служыць розныя графічныя арганізатары: ментальныя карты або асацыяграмы, якія могуць выкарыстоўвацца для візуалізацыі іерархіі і адносін паміж граматычнымі і лексічнымі канструкцыямі.

Актуальным і цікавым метадам на этапе замацавання матэрыялу з’яўляюцца інтэлект-карткі. “Інтэлект-карта (ад англійскага Mind Map) – пе-раскладаецца як карта розуму, разумовая карта, ментальная карта ці інтэлект-карта. < … > З дапамогай разумовых карт можна размеркаваць вядомую інфармацыю і зразумець, чаго не хапае, выявіць моцныя і слабыя бакі нашых уяўленняў аб прадмеце, убачыць, як укладаецца новы змест у старыя рамкі, якія кампаненты мадэлі злучаны, а паміж якімі сувязь яшчэ не ўсталявана” [1, с. 70].

Псіхалагічныя механізмы дзеяння метаду звязаны з актывізацыяй абагульнена-вобразнага мыслення і фарміраваннем устойлівых асацыятыўных сувязяў. Гэта асабліва важна для засваення складаных правіл і выключэнняў з іх, у такіх выпадках, калі традыцыйныя лінейныя метады запамінання аказваюцца недастаткова эфектыўнымі.

Педагагічная эфектыўнасць метаду праяўляецца ў трансфармацыі пасіўнага шляху атрымання ведаў школьнікамі ў актыўны, дзе вучні становяцца непасрэднымі ўдзельнікамі працэсу. Сістэматычнае выкарыстанне інтэлект-карт прыводзіць да фарміравання ўстойлівых метапазнавальных стратэгій, што дазваляе вучням эфектыўна арганізоўваць і рэалізоўваць уласныя пазнавальныя працэсы.

Актуальным на этапе замацавання матэрыялу становіцца выкарыстанне розных відаў інфаграфікі, такіх як інфаграфіка-схема, інфаграфіка-параўнанне, інфаграфіка-калаж. Інфаграфіка, дзякуючы сваёй візуальнай прэзентацыі, дапамагае структуравана перадаць складаныя ідэі, спрасціць успрыманне інфармацыі і зрабіць навучальны працэс больш дынамічным і інтэрактыўным.

Наступным метадам, які набірае папулярнасць сярод метадаў нагляднасці, з’яўляецца прыём INSERT. Дадзены прыём выкарыстоўваецца ў адукацыйнай практыцы для актывізацыі крытычнага мыслення і ўцягвання школьнікаў у працэс навучання. Гэты прыём дапамагае глыбей асэнсоўваць матэрыял, які вывучаецца, а таксама спрыяе развіццю аналітычных і творчых здольнасцей вучняў.

Сутнасць дадзенага метаду ў здабыванні новай інфармацыі вучнямі, а таксама вычляненні ўжо вядомай інфармацыі. INSERT актывізуе ўзаемадзеянне вучняў з тэкстам падчас чытання, садзейнічаючы больш глыбокаму разуменню матэрыялу і развіццю крытычнага і аналітычнага мыслення.

Ужыванне прыёму “INSERT” мае мноства пераваг: ён робіць навучанне больш актыўным, развівае крытычнае мысленне, дапамагае сістэматызаваць веды і паляпшае навыкі камунікацыі. У канчатковым выніку гэты падыход спрыяе лепшаму засваенню навучальнага матэрыялу. Вельмі актуальным будзе выкарыстанне дадзенага метаду пры замацаванні тэм, якія вывучаюцца больш падрабязна і паглыблена ў старэйшых класах.

Выкарыстанне сродкаў нагляднасці і метадаў візуалізацыі на этапе замацавання матэрыялу на ўроках мовы можна назваць вельмі важным прыёмам, які павінен прымяняцца ў сучаснай школе. Гэтыя метады спрыяюць больш глыбокаму разуменню і запамінанню матэрыялу дзякуючы актывацыі розных кагнітыўных працэсаў, што дазваляе вучням не толькі ўспрымаць інфармацыю, але і структуравана яе асвойваць, разумець і замацоўваць.

## Літаратура

1 Ястремская, Т. В. Использование метода интеллект-карт с детьми старшего дошкольного возраста / Т. В. Ястремская, Н. И. Бутова, М. И. Сурманова // Наука через призму времени. – 2021. – № 12 (57). – С. 70–72.